# КП(б)Б у заключным годзе пяцігодкі

## на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва

# даб'ецца новых перамог

### З дакладу сэкратара ЦК КП(б)Б тав. ГЕЯ на II Менскай гарадзкой партканфэрэнцыі

Таварышы! КП(б)Б праводзіць сваю работу па соцыялістычным будаўніцтве на рубяжы двух сьветаў — капіталістычнага і соцыялістычнага. Гэта абавязвае нас ні на хвіліну не аслабляць нашай работы па ўмацаваньню абароназдольнасьці нашай савецкай краіны, па павышэньню баявой магутнасьці Чырвонай арміі.

Даючы глыбокі аналіз міжнароднаму становішчу і тым суадносінам клясавых сіл, якія стварыліся за апошнія гады ў капіталістычных краінах, тав. Гей даў разгорнуты малюнак паглыбленьня экономічнага крызісу ў краінах капіталу, паказаў тыя напрамкі, па якіх гэты крызіс разьвіваецца.

Характарызуючы работу прамысловасьці БССР у трэцім, рашаючым годзе пяцігодкі, тав. Гей на радзе конкрэтных лічбаў і фактаў паказаў наколькі шпаркімі тэмпамі разьвіваецца прамысловасьць нашай рэспублікі.

Ахарактарызаваўшы станов'ішча работы па перабудове кооперацыі і разгортваньні савецкага гандлю ва ўмовах БССР, тав. Гей паставіў конкрэтныя задачы на гэтым адказьнейшым вучастку работы.

Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б), КП(б)Б дабілася вялікіх посьпехаў у соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі. Мінулы год быў годам шпаркага росту соцыялістычных элемэнтаў на вёсцы. Бягучы год павінен даць прырост пасеўнай плошчы па саўгасах больш, як у два разы.

У бягучым годзе проэктуецца капітальныя ўкладаньні ў саўгаснае будаўніцтва давесьці да 45 млн рублёў.

Шпаркі рост саўгасаў у сваім выніку даў значнае пашырэньне таварнай сельска-гаспадарчай продукцыі. Пагалоўе рагатай жывёлы саўгасаў вырасла амаль у два разы. Сьвінага-

накіраваных на організацыйна-гаспадарчае умацаваньне колгасаў, на павышэньне колгаснай вытворчасьці.

Задача партыйных організацый і ў першую чаргу жывёлагадоўчых раёнаў заключаецца у тым, каб ў 1932 годзе дабіцца перавыкананьня плянаў соцыялістычнай жывёлагадоўлі, дабіцца таго, каб нашы колгасы сапраўды па-баявому, сапраўды узорна выканалі заданьне па здачы (продажу) таварнай продукцыі жывёлагадоўлі дзяржаве.

Аналізуючы работу КП(б)Б ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва. тав. Гей гаворыць:

— Калі да Кастрычніцкай рэволюцыі ў Беларусі было толькі 30 проц. пісьменнага насельніцтва, то зараз пад кіраўніцтвам КП(б)Б БССР перат варацца у краіну суцэльнай пісьменнасьці.

Пасьпяхова разьвіваецца беларус-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы